# ВЯЛІКІ КАМЕНЬ[1]

*Прачытайце ўводзіны. Затым пераходзьце да выканання заданняў.*

**Уводзіны**

Соня разам з іншымі навучэнцамі Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка была на экскурсіі ў Кітайска-Беларускім індустрыяльным парку "Вялікі камень". На экскурсіі юнакі і дзяўчаты наведалі Інавацыйны цэнтр, пазнаёміліся з гісторыяй індустрыяльнага парка, структурай яго кіравання і прыярытэтнымі напрамкамі дзейнасці. Падчас прагулкі па гэтым парку навучэнцы змаглі ўбачыць сумесныя прадпрыемствы і гандлёва-лагістычныя цэнтры, якія працуюць на яго тэрыторыі.

Соня настолькі зацікавілася інавацыйнай дзейнасцю індустрыяльнага парка "Вялікі камень", што пачала шукаць у інтэрнэце дадатковую інфармацыю пра яго гісторыю і развіццё. На сайце газеты "Звязда" дзяўчынка натрапіла на інфармацыйную нататку пра новых рэзідэнтаў Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка "Вялікі камень".

Прычытайце тэкст нататкі.

---

[1] Задание разработано в рамках ОНТП «Научно-методическое обеспечение формирования функциональной грамотности обучающихся в образовательном процессе» («Функциональная грамотность», № ГР 20212108).

**У індустрыяльным парку “Вялікі камень” рэгіструюцца новыя рэзідэнты і ствараюцца кластары**

17.05.2025 | 17:15




Як падкрэслілі ў адміністрацыі парка, усяго тут зарэгістравана 150 рэзідэнтаў, што сведчыць аб няўхільным росце прывабнасці пляцоўкі для замежных і айчынных інвестараў. Заяўлены агульны аб’ём інвестыцый гэтых рэзідэнтаў дасягае сумы ў 1,57 мільярда долараў. Дадзеныя інвестыцыі, разам з планамі па стварэнні парадку 16 тысяч новых працоўных месцаў, паказваюць на значны патэнцыял парка для стымулявання эканамічнага росту нашай краіны і стварэння высокатэхналагічных працоўных месцаў.

На сёння ўжо 54 рэзідэнты прыступілі да рэалізацыі сваіх праектаў, зрабіўшы адчувальны ўнёсак у беларускую эканоміку. Сёлета парк папоўніўся дзевяццю новымі рэзідэнтамі з Расіі, КНР, Швейцарыі, Турцыі і Беларусі. У цэлым рэзідэнты парка прадстаўляюць 15 краін свету. Гэта геаграфічная разнастайнасць падкрэслівае міжнародны характар праекта і яго прывабнасць для інвестараў з розных краін.

– Разнастайнасць галін, прадстаўленых у “Вялікім камені”, таксама з’яўляецца адным з ключавых фактараў яго поспеху, – падкрэслілі ў парку.

Дарэчы, тут пачалі фарміраванне 4 кластары: у сферы машынабудавання – 31 праект, электронікі і тэлекамунікацый – 15 праектаў, біятэхналогій, фармацэўтыкі і медыцынскай прадукцыі – 23 праекты, а таксама комплекснай лагістыкі – 15 праектаў.

– Далейшая дзейнасць парка таксама будзе накіравана на прыцягненне новых інвестараў, стварэнне спрыяльных умоў для развіцця рэзідэнтаў і пастаяннае ўдасканаленне і развіццё інфраструктуры, – запэўнілі ў адміністрацыі “Вялікага каменя”.

*(паводле інфармацыі з сайта выдавецкага дома “Звязда”)*

**Заданне 1 / 6**

*Прачытайце тэкст нататкі “У індустрыяльным парку «Вялікі камень» рэгіструюцца новыя рэзідэнты і ствараюцца кластары”. Для адказу на пытанне адзначце патрэбныя варыянты адказаў.*

**Назвы якіх краін фігуруюць у тэксце нататкі?**

- Карэя
- Беларусь
- Швецыя
- Расія
- Кітай
- Швейцарыя
- Турцыя
- Кыргызстан

**Заданне 2 / 6**

*Выкарыстайце тэкст нататкі “У індустрыяльным парку «Вялікі камень» рэгіструюцца новыя рэзідэнты і ствараюцца кластары”. Адзначце выказванне, якое не адпавядае зместу тэксту.*

- У індустрыяльным парку зарэгістравана 150 рэзідэнтаў
- У індустрыяльным парку працуе 16 тысяч чалавек
- У індустрыяльным парку зарэгістраваны резідэнты з 15 краін свету
- У індустрыяльным парку пачалося фарміраванне 4 кластараў

**Заданне 3 / 6**

*Выкарыстайце тэкст нататкі “У індустрыяльным парку «Вялікі камень» рэгіструюцца новыя рэзідэнты і ствараюцца кластары”. Адзначце сказ з натакі, які найбольш дакладна можа патлумачыць, чаму на фотаздымку назва індустрыяльнага парка “Вялікі камень” пададзена на англійскай мове.*

- Заяўлены агульны аб’ём інвестыцый гэтых рэзідэнтаў дасягае сумы ў 1,57 мільярда долараў.
- Разнастайнасць галін, прадстаўленых у “Вялікім камені”, з’яўляецца адным з ключавых фактараў яго поспеху.
- Гэта геаграфічная разнастайнасць падкрэслівае міжнародны характар праекта і яго прывабнасць для інвестараў з розных краін.

**Заданне 4 / 6**

*Выкарыстайце тэкст нататкі “У індустрыяльным парку “Вялікі камень” рэгіструюцца новыя рэзідэнты і ствараюцца кластары”.*
*Адказ на пытанне запішыце лічбай.*

**Колькі новых рэзідэнтаў з’явілася ў індустрыяльным парку “Вялікі камень” з пачатку 2025 года?**

**Заданне 5 / 6**

*Выкарыстайце тэкст нататкі “У індустрыяльным парку «Вялікі камень» рэгіструюцца новыя рэзідэнты і ствараюцца кластары”.*
*Адказы на заданне запішыце ў выглядзе спалучэння лічбы і літары, напрыклад,* ***1Б, 2В, 3А.***

**Найдзіце адпаведнасць паміж назвамі кластараў, пра якія вядзецца размова ў нататцы, з колькасцю праектаў, якія рэалізуюцца ў індустрыяльным парку “Вялікі камень” па кожным з напрамкаў інавацыйнай дзейнасці.**

| Кластар | Колькасць праектаў |
|---|---|
| **1.** Біятэхналогіі, фармацэўтыка і медыцынская прадукцыя | **А.** 23 праекты |
| **2.** Машынабудаванне | **Б.** 31 праект |
| **3.** Электроніка і тэлекамунікацыі | **В.** 15 праектаў |

**Заданне 6 / 6**

*Выкарыстайце тэкст нататкі “У індустрыяльным парку «Вялікі камень» рэгіструюцца новыя рэзідэнты і ствараюцца кластары” і запоўніце табліцу.*

*Для адказу выберыце варыянт “так” ці “не”.*

| Сцвярджэнне | Так | Не |
|---|---|---|
| Адміністрацыя індустрыяльнага парка “Вялікі камень” зацікаўлена ў прыцягненні выключна замежных інвестыцый | | |
| Удасканаленне і развіццё інфраструктуры з’яўляецца адным з кірункаў дзейнасці індустрыяльнага парка “Вялікі камень” | | |
| Заяўлены агульны аб’ём інвестыцый зарэгістраваных рэзідэнтаў індустрыяльнага парка “Вялікі камень” дасягае сумы ў 1,57 мільярда рублёў | | |
| Больш за траціну з агульнай колькасці зарэгістраваных рэзідэнтаў індустрыяльнага парка “Вялікі камень” ужо прыступілі да рэалізацыі сваіх праектаў | | |